# АЛЯКСАНДР ВІКТАРАВІЧ ШАРАПА



26 студзеня споўнілася 60 год з дня нараджэння дэкана факультэта міжнародных адносін Белдзяржуніверсітэта, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Віктаравіча Шарапы.

А.В.Шарапа нарадзіўся ў 1938 г. у сялянскай сям'і (вёска Хадароўцы Лідскага раёна). Пасля сканчэння сярэдняй школы, а потым (1960 г.) Мінскага педагагічнага інстытута працаваў настаўнікам-выхавацелем Вілейскай школы-інтэрната. Займаў розныя пасады ў камсамольскіх і партыйных органах. У 1978 г. пасля сканчэння ВПШ пры ЦК САПГ (Берлін) там жа абараняе кандыдацкую дысертацыю.

З 1982 г. працуе ў Белдзяржуніверсітэце прарэктарам па міжнародных сувязях. У 1988 г. абараняе ў Германіі доктарскую дысертацыю. У 1992 г. па ініцыятыве А.В.Шарапы на гістарычным факультэце ствараецца кафедра міжнародных адносін, якую ён і ўзначальвае. У кастрычніку 1995 г. быў адкрыты факультэт міжнародных адносін, і прафесар А.В.Шарапа становіцца яго першым дэканам. Менавіта пад яго кіраўніцтвам распрацаваны прынцыпова новыя вучэбныя планы, упершыню ў Рэспубліцы Беларусь пачата падрыхтоўка кадраў спецыялістаў-міжнароднікаў.

За гады працы ва універсітэце Аляксандр Віктаравіч зарэкамендаваў сябе высокакваліфікаваным спецыялістам і выдатным арганізатарам навучальнага працэсу, выхаваўчай работы, які ўмела спалучае службовыя абавязкі з актыўнай грамадскай дзейнасцю.

Прафесар А.В.Шарапа падрыхтаваў шмат высокакваліфікаваных спецыялістаў. Добра зарэкамендавалі сябе яго выпускнікі-аспіранты, кандыдаты навук як у Беларусі, так і за яе межамі. Пад яго кіраўніцтвам абаронена звыш 10 доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый. На працягу пяці апошніх гадоў ён узначальвае спецыялізаваны савет па абароне дысертацый у галіне гістарычных навук, з'яўляецца членам рэдкалегіі часопіса "Веснік БДУ".

Важкі і асабісты ўклад А.В.Шарапы ў грамадазнаўчыя і гістарычныя навукі. Ён кіраўнік комплекснай навуковай праграмы "Міжнародныя аспекты развіцця Рэспублікі Беларусь". У рамках гэтага даследавання нядаўна выдадзены ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі зборнік дакументаў і матэрыялаў "Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь". Раней, у 1995 г., пад яго кіраўніцтвам завершана навуковая распрацоўка па тэме "Рэспубліка Беларусь у сістэме міжнародных адносін Еўропы". Ім апублікаваны 57 навуковых прац, у тым ліку манаграфія, брашуры і артыкулы аб прыярытэтах знешнепалітычнай стратэгіі нашай дзяржавы. Дзякуючы намаганням А.В.Шарапы ўзначальваемая ім кафедра з'яўляецца членам Асацыяцыі вышэйшай школы Цэнтральнай і Усходняй Еўропы па даследаваннях у галіне міжнародных адносін. Ён наладзіў кантакты з Жэнеўскім інстытутам міжнародных даследаванняў, Венскай дыпламатычнай акадэміяй, са свабодным універсітэтам Берліна (ФРГ).

Як вучоны і практык у галіне міжнародных адносін прафесар А.В.Шарапа працуе ў грамадскім савеце па пытаннях бяспекі пры Міністэрстве замежных спраў Беларусі. Ён быў адным з ініцыятараў стварэння Асацыяцыі вышэйшых школ краін СНД па падрыхтоўцы міжнароднікаў і сёння з'яўляецца членам яе прэзідыума.

Сваё 60-годдзе Аляксандр Віктаравіч сустрэў у росквіце фізічных і творчых сіл. Супрацоўнікі, аспіранты і студэнты факультэта міжнародных адносін, рэдакцыя і рэдкалегія часопіса "Веснік БДУ" жадаюць юбіляру шчасця ў асабістым жыцці, моцнага здароўя і далейшых творчых поспехаў.